ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне №782 от 07.10.2019
Гомельскага абласнога
выканаўчага камітэта

# СТАТУТ
## дзяржаўнай установы адукацыі «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі»

# УСТАВ
## государственного учреждения образования «Гомельский областной институт развития образования»

горад Гомель, 2019

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі» створана як установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны абласны інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі», заснавана на падставе рашэння Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта ад 2 красавіка 2001 г. № 230 і зарэгістравана рашэннем Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта ад 29 чэрвеня 2001г. №567 ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў за № 400469580.

Распараджэннем старшыні Гомельскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 2 чэрвеня 2008 г. № 139-р зарэгістравана перайменаванне ўстановы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны абласны інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі» у дзяржаўную ўстанову адукацыі «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі» (далей – Установа).

Статут зацверджаны ў новай рэдакцыі ў сувязі са зменай большасці палажэнняў Статута.

2. Тып Установы – установа дададковай адукацыі дарослых.

Від Установы – інстытут развіцця адукацыі.

3. Поўная назва Установы:

на рускай мове – государственное учреждение образования «Гомельский областной институт развития образования»;

на беларускай мове – дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі»;

скарочаная назва Установы:

на рускай мове – Гомельский областной институт развития образования;

на беларускай мове – Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі.

4. Установа з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, якая часткова фінансуецца з абласнога бюджэту.

Маёмасць Установы належыць на праве ўласнасці Гомельскай вобласці, распараджэнне якой ажыццяўляе ў адпаведнасці з заканадаўствам Гомельскі абласны Савет дэпутатаў (далей – Уласнік), і замацоўваецца за Установай на праве аператыўнага кіравання.

5. Заснавальнікам Установы з’яўляецца Гомельскі абласны выканаўчы камітэт (далей – Заснавальнік). Органам дзяржаўнага кіравання Установы з’яўляецца галоўнае ўпраўленне адукацыі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта (далей – Упаўнаважаны орган).

6. Установа ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе дададковай адукацыі дарослых, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28 ліпеня 2011 г. № 198, рашэннямі Уласніка і Заснавальніка, загадамі Упаўнаважанага органа, сапраўдным Статутам і іншымі актамі заканадаўства.

7. Установа з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае самастойны баланс, разліковы і іншыя рахункі ў банках, пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і сваім найменнем, штампы, пячаткі, бланкі і іншыя рэквізіты, неабходныя для выканання сваёй дзейнасці, нясе асабістую адказнасць па сваіх абавязках, можа ад свайго імя набываць і ажыццяўляць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе.

8. Установа адказвае па сваіх абавязках грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца ў яе распараджэнні. Пры іх недастатковасці субсідыярную адказнасць нясе Уласнік.

Установа не мае права выступаць гарантам або даручальнікам перад банкамі-крэдыторамі юрыдычных асоб недзяржаўнай формы ўласнасці і фізічных асоб па выкананні гэтымі асобамі сваіх абавязкаў па вяртанні атрыманых крэдытаў, акрамя выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

9. Установа самастойная ў ажыццяўленні адукацыйнай, інфармацыйна-аналітычнай, арганізацыйна-метадычнай дзейнасці, дзейнасці па навукова-метадычным забеспячэнні адукацыі, падборы і расстаноўцы кадраў, фінансава-гаспадарчай і іншай дзейнасці ў межах заканадаўства.

10. Статут Установы зацвярджаецца Заснавальнікам і падлягае рэгістрацыі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўства. Установа забяспечвае ўмовы для азнаямлення слухачоў і работнікаў са Статутам.

11. Змены і дадаткі ў Статут Установы ўносяцца ў парадку, усталяваным заканадаўствам.

12. Установа ажыццяўляе міжнароднае супрацоўніцтва ў адпаведнасці з заканадаўствам, міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь у вобласці адукацыі.

13. Месца знаходжання: Рэспубліка Беларусь, 246032, горад Гомель, вуліца Юбілейная, 7.

## ГЛАВА 2
## ПРАДМЕТ, МЭТЫ, ЗАДАЧЫ І ФУНКЦЫІ ДЗЕЙНАСЦІ УСТАНОВЫ

14. Прадметам дзейнасці з'яўляецца рэалізацыя адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, інфармацыйна-аналітычная,

арганізацыйна-метадычная і навукова-метадычная дзейнасць па бесперапыннай прафесійнай адукацыі кіруючых кадраў і спецыялістаў адукацыі, развіцці сістэмы адукацыі, якая адпавядае мэтам і задачам, вызначаным сапраўдным Статутам. Дадатковая адукацыя забяспечвае прафесійнае развіццё слухачоў і задавальненне іх прафесійных запатрабаванняў.

15. Мэтай дзейнасці Установы з'яўляецца забеспячэнне павышэння ўзроўню прафесійных ведаў і ўменняў, удасканаленне дзелавых якасцяў кадраў, іх падрыхтоўка да выканання новых працоўных функцый праз:

рэалізацыю адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых;

навукова-метадычнае забеспячэнне дзейнасці ўстаноў дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі, сацыяльна-педагагічных устаноў, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, выхаваўча-аздараўленчых устаноў, устаноў, якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забяспячэнне адукацыі ў Гомельскай вобласці;

планаванне павышэння кваліфікацыі;

інфармацыйна-аналітычнае і арганізацыйна-метадычнае забеспячэнне сістэмы адукацыі, вядзенне баз дадзеных педагагічных кадраў Гомельскай вобласці, адораных дзяцей і моладзі;

навучанне кіруючых работнікаў і спецыялістаў органаў мясцовага кіравання і самакіравання Гомельскай вобласці.

16. Асноўнымі задачамі Установы з'яўляюцца:

забеспячэнне ўстойлівага інавацыйнага развіцця рэгіянальнай сістэмы адукацыі праз удасканальванне прафесіяналізму занятых у адукацыйнай галіне кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

вывучэнне тэндэнцый развіцця сусветнай і нацыянальнай сістэм адукацыі і аптымізацыя ў адпаведнасці з імі практыкі рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі спецыялістаў і кіраўнікоў устаноў адукацыі Гомельскай вобласці;

стварэнне для слухачоў неабходных умоў для навучання і самаадукацыі;

задавальненне патрэб органаў мясцовага кіравання і самакіравання, арганізацый у высокапрафесійных кадрах для забеспячэння эфектыўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна, а таксама індывідуальных запытаў грамадзян у павышэнні ўзроўню іх прафесійнай падрыхтоўкі;

удзел у планаванні мерапрыемстваў па рэалізацыі рэспубліканскіх праграм развіцця сістэмы дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з улікам рэгіянальнай спецыфікі;

каардынацыя дзейнасці устаноў, якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забяспячэнне адукацыі;

стварэнне сумесна з органамі мясцовага кіравання і самакіравання Гомельскай вобласці сістэмы бесперапыннага прафесійнага навучання кадраў і яе развіццё;

навукова-метадычнае і арганізацыйна-метадычнае суправаджэнне інавацыйных і эксперыментальных працэсаў у сістэме і ўстановах адукацыі Гомельскай вобласці;

распрацоўка і своечасовае абнаўленне вучэбных праграм, вучэбна-тэматычных планаў, даведачных, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, іншых матэрыялаў, удзел у распрацоўцы вучэбных дапаможнікаў;

распрацоўка і ўкараненне сучасных інфармацыйна-камунікатыўных педагагічных тэхналогій і тэхналогій кіравання ў практыку работы;

інфармацыйна-аналітычнае забеспячэнне сістэмы адукацыі Гомельскай вобласці;

стварэнне эфектыўнага інструментарыя выяўлення адукацыйных патрэб і прафесійных цяжкасцяў кадраў сістэмы адукацыі;

арганізацыйнае і навукова-метадычнае суправаджэнне конкурсаў педагагічнага майстэрства, абласных выстаўках, фестываляў;

выяўленне, абагульненне і распаўсюджванне прадуктыўнага педагагічнага вопыту;

забеспячэнне якасці навучання, узмацненне яго практычнай значнасці і скіраванасці на вырашэнне канкрэтных вытворчых задач;

паляпшэнне сучаснай матэраяльна-тэхнічнай базы, аснашчэнне яе новым абсталяваннем, паліграфічнай, офіснай і вылічальнай тэхнікай;

арганізацыйна-метадычнае суправаджэнне працы з высокаматываванымі і інтэлектуальна адоранымі дзецьмі;

арганізацыйна-метадычнае суправаджэнне падрыхтоўкі рэзерву кіруючых работнікаў;

прапаганда культуры рацыянальнага выкарыстання энергетычных і іншых прыродных рэсурсаў, навукова-метадычнае суправаджэнне дадзенага віду дзейнасці ва ўстановах адукацыі;

аказанне паслуг прыватным асобам і арганізацыям у атрыманні псіхолага-педагагічных, юрыдычных, эканамічных і іншых ведаў праз рэалізацыю адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых, семінары, рэпетытарства і індывідуальныя кансультацыі на аснове прадпрымальніцкай гаспадарча-разліковай дзейнасці;

развіццё ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі ў галіне развіцця рэгіянальнай сістэмы адукацыі, павышэння прафесійнага ўзроўню педагагічных кадраў;

павышэнне кваліфікацыі работнікаў органаў мясцовага кіравання і самакіравання Гомельскай вобласці, іншых дзяржаўных арганізацый;

стварэнне і падтрыманне ў працоўным стане сістэмы менеджменту якасці Установы.

17. Асноўнымі функцыямі Установы з’яўляюцца:

рэалізацыя адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых;

каардынацыя дзейнасці устаноў, якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі;

ажыццяўленне падтрымкі адукацыйнай і навукова-метадычнай дзейнасці ўсіх падраздзяленняў Установы па прыярытэтных напрамках развіцця сістэмы адукацыі Гомельскай вобласці, правядзенне навукова-даследчай работы;

арганізацыя экспертна-аналітычнай, дыягнастычнай і кансалтынгавай дзейнасці ў адносінах да стану адукацыйнага працэсу, адукацыйнага асяроддзя, суправаджэнне сістэмы адукацыі Гомельскай вобласці;

распрацоўка і рэалізацыя аўтарскіх адукацыйных праграм па праблемах дадатковай адукацыі дарослых;

аказанне арганізацыйна-метадычнай і навукова-метадычнай падтрымкі ўстановам адукацыі камунальнай формы ўласнасці Гомельскай вобласці;

ажыццяўленне ў вызначаным парадку рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці;

стварэнне неабходных умоў працы, ахова здароўя слухачоў і работнікаў Установы згодна патрабаванням нормаў аховы працы, правілаў унутранага працоўнага распарадку і працоўнай дысцыпліны.

18. На падставе Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 верасня 2010 г. № 450 «Аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці» Установа пасля атрымання ва ўстаноўленым парадку спецыяльных дазваленняў (ліцэнзій) ажыццяўляе наступныя віды дзейнасці:

адукацыйная дзейнасць;

медыцынская дзейнасць;

дзейнасць па забеспячэнні бяспекі юрыдычных і фізічных асоб.

Віды дзейнасці, дзеля ажыццяўлення якіх неабходна атрыманне дазваленняў (ліцэнзій), ажыццяўляюцца Установай толькі на падставе адпаведнага дазвалення (ліцэнзіі).

Права Установы ажыццяўляць дзейнасць, для занятку якой неабходна атрыманне ліцэнзіі, узнікае з моманту атрымання ліцэнзіі або ў вызначаны тэрмін і спыняецца па заканчэнні тэрміна дзеяння ліцэнзіі, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

19. У адпаведнасці з агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь АКРБ 005-2011 «Віды эканамічнай дзейнасці», зацверджаным пастановай Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь ад 5 снежня 2011 г. № 85 Установа ажыццяўляе наступныя віды эканамічнай дзейнасці:

17290 Вытворчасць іншых вырабаў з паперы і кардону

18130 Дзейнасць па падрыхтоўцы матэрыялаў да друку і распаўсюджвання

18140 Брашуровачна-пераплётная, апрацоўчая дзейнасць і спадарожныя паслугі

46180 Дзейнасць агентаў, якія спецыялізуюцца на аптовым гандлі асобнымі відамі тавараў, не ўключанымі ў другія групоўкі

52100 Складзіраванне і захоўванне

55102 Прадстаўленне паслуг гасцініцамі і аналагічнымі месцамі для пражывання без рэстаранаў

55900 Прадстаўленне паслуг іншымі месцамі для пражывання

56290 Іншыя паслугі па грамадскім харчаванні

58110 Выдавецтва кніг

58199 Іншыя віды выдавецкай дзейнасці, не ўключаныя ў другія групоўкі

59110 Дзейнасць па вытворчасці кіна-, відэафільмаў і тэлевізійных праграм

59130 Дзейнасць па распаўсюджванні кіна-, відэафільмаў і тэлевізійных праграм

59140 Дзейнасць па паказе кінафільмаў

68200 Здача ўнаём уласнай і арэндуемай нерухомай маёмасці

77290 Арэнда і лізінг іншых прадметаў асабістага спажывання і бытавых тавараў

77330 Арэнда і лізінг офісных машын і абсталявання, улічваючы вылічальную тэхніку

82190 Дзейнасць па капіраванні, падрыхтоўцы дакументаў і іншая спецыялізаваная офісная дзейнасць

85590 Іншыя віды адукацыі, не ўключаныя ў другія групоўкі

86210 Агульная ўрачэбная практыка

86230 Стаматалагічная дзейнасць

86901 Дзейнасць па ахове здароўя, якая ажыццяўляецца работнікамі, якія маюць сярэднюю спецыяльную медыцынскую адукацыю

88990 Іншыя сацыяльныя паслугі без забеспячэння пражывання, не ўключаныя ў другія групоўкі

91011 Дзейнасць бібліятэк

91012 Дзейнасць архіваў

91020 Дзейнасць музеяў

93110 Дзейнасць фізкультурна-спартыўных збудаванняў

93190 Іншая дзейнасць у галіне фізічнай культуры і спорту

93290 Іншая дзейнасць па арганізацыі адпачынку і забаўляльных мерапрыемстваў

96020 Прадстаўленне паслуг цырульнямі і салонамі прыгажосці

96040 Дзейнасць па забеспячэнні фізічнага камфорту

96090 Прадстаўленне іншых індывідуальных паслуг, не ўключаных у другія групоўкі.

20. Установа мае права ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць прыбытак, толькі ў тым выпадку, калі яна неабходна для статутных мэт, дзеля якіх Установа створана, і адпавядае гэтым мэтам. Атрыманыя ад такой дзейнасці прыбыткі і набытая за іх кошт уласнасць паступаюць у самастойнае распараджэнне Установы і расходуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

## ГЛАВА 3
## АДУКАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ УСТАНОВЫ

21. Адукацыйная дзейнасць Установы ажыццяўляецца на аснове прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі, адукацыйных стандартаў, сучасных адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій, і на педагагічна абгрунтаваным выбары форм, метадаў, сродкаў навучання і выхавання, якія ўлічваюць культурныя традыцыі і каштоўнасці беларускага народа, іншых нацыянальных супольнасцяў краіны, дасягненні сусветнай культуры, а таксама ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі Установы. Арганізацыя адукацыйнага працэсу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб установе дададковай адукацыі дарослых, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28 ліпеня 2011 г. № 198.

22. Ва Установе рэалізуюцца адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дарослых: адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў; адукацыйная праграма перападрыхтоўкі; адукацыйная праграма стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў; адукацыйная праграма навучаючых курсаў.

23. Установа ажыццяўляе павышэнне кваліфікацыі кадраў з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй па профілях, напрамках адукацыі:

Профіль адукацыі «Педагогіка», напрамак адукацыі «Педагогіка дзяцінства», «Педагогіка падлеткавага і юнацкага ўзросту», «Педагогіка агульнаўзроставая»;

Профіль адукацыі «Камунікацыі. Права. Эканоміка. Кіраванне. Эканоміка і арганізацыя вытворчасці», напрамкі адукацыі «Камунікацыі», «Эканоміка», «Кіраванне» ;

Профіль адукацыі «Грамадскае харчаванне. Побытавае абслугованне», напрамак адукацыі «Грамадскае харчаванне. Побытавае абслугоўванне».

Лімітавая колькасць слухачоў, якія навучаюцца на вочнай (дзённай) форме атрымання адукацыі – 320 чалавек.

Павышэнне кваліфікацыі кадраў з вышэйшай адукацыяй па профілях, напрамках адукацыі:

Профіль адукацыі «Педагогіка. Прафесійная адукацыя», напрамак адукацыі «Кіраўніцтва ў сферы адукацыі»;

Профіль адукацыі «Тэхніка і тэхналогіі», напрамак адукацыі «Ахова працы».

Лімітавая колькасць слухачоў, якія навучаюцца на вочнай (дзённай) форме атрымання адукацыі – 30 чалавек.

24. Установа ажыццяўляе перападрыхтоўку кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, па завочнай форме навучання, па наступнай спецыяльнасці і спецыялізацыі, уключанай у Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 011-2009 «Спецыяльнасці і кваліфікацыі», зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 2 чэрвеня 2009 г. № 36:

спецыяльнасць: 1-01 03 72 «Дашкольная адукацыя»

кірунак спецыяльнасці: «Педагогіка дзяцінства»

кваліфікацыя: « Педагог».

25. Выхаваўчая дзейнасць Установы будуецца на аснове прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі і выхавання і ажыццяўляецца на падставе дзяржаўных планаў і праграм, нарматыўных прававых актаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

26. Выхаванне ажыццяўляецца на агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцях, культурных і духоўных традыцыях беларускага народа, дзяржаўнай ідэалогіі, адлюстроўвае інтарэсы асобы, грамадства і дзяржавы.

27. Асноўнымі мовамі навучання ва Установе з’яўляюцца беларуская і руская.

28. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых арганізуецца па каляндарных гадах і дзеліцца на два паўгоддзі.

29. Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых з’яўляецца вучэбны занятак. Адукацыйны працэс можа арганізоўвацца ў вочнай і завочнай форме. Вучэбныя заняткі могуць быць арганізаваны ў форме лекцый, семінараў, практычных і лабараторных заняткаў, практычных выязных заняткаў, дзелавых гульняў, круглых сталоў, канферэнцый, дыскусій.

30. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых ажыццяўляецца ў вучэбных групах.

Напаўняльнасць вучэбных груп слухачоў, якія асвойваюць адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, складае ад 25 да 30 чалавек. Вучэбныя групы могуць дзяліцца на падгрупы ў парадку, вызначаным нарматыўнымі дакументамі.

Напаўняльнасць вучэбных груп слухачоў, якія асвойваюць адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў за кошт юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, фізічных асоб або асабістых сродкаў грамадзян складае да 30 чалавек.

Напаўняльнасць вучэбных груп слухачоў, якія асвойваюць адукацыйныя праграмы навучальных курсаў за кошт юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, фізічных асоб або асабістых сродкаў грамадзян складае да 40 чалавек.

Напаўняльнасць вучэбных груп слухачоў, якія асвойваюць адукацыйныя праграмы перападрыхтоўкі, якія навучаюцца за кошт юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, фізічных асоб або асабістых сродкаў грамадзян складае да 30 чалавек.

31. Ва Установе прадугледжваюцца наступныя асноўныя формы: вучэбных заняткаў са слухачамі – лекцыі, практычныя, семінарскія заняткі, дзелавыя, арганізацыйна-дзейнасныя гульні, круглыя сталы, трэнінгі, педагагічныя майстэрні, майстар-класы і іншыя;

выніковай атэстацыі слухачоў – кантрольныя, курсавыя і выпускныя работы і іншыя;

работы пасля вучэбных заняткаў – кансультацыі, самастойная работа слухачоў і іншыя.

32. Парадак прыёму, адлічэння асоб, якія навучаюцца вызначаецца заканадаўствам.

У выпадку парушэння правілаў унутранага распарадку для слухачоў і правілаў унутранага распарадку ў інтэрнаце асоба, якая навучаецца, можа быць адлічана з Установы загадам рэктара ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

33. Узровень ведаў слухачоў пры рэалізацыі адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі вызначаецца па выніках выніковай атэстацыі (заліка, субяседвання, абароны выпускной работы) і ацэньваецца адзнакамі «залічана», «не залічана».

Вынікі цякучай і выніковай атэстацыі асоб, якія навучаюцца пры рэалізацыі адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў ацэньваюцца адзнакамі ў балах па дзесяцібальнай шкале ці адзнакамі «залічана», «не залічана».

Станоўчымі з’яўляюцца адзнакі  не ніжэй за 4 (чатыры) балы ці адзнака «залічана».

34. Для планавання павышэння кваліфікацыі, арганізацыі навучальнага працэсу і забеспячэння яго якасці ва Установе праводзіцца арганізацыйна-метадычная, метадычная, навукова-метадычныя і вучэбна-метадычная работа.

35. Эксперыментальная і інавацыйная дзейнасць Установы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, дзеючым заканадаўствам.

36. Кантроль і самакантроль за забеспячэннем якасці адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у тым ліку праз рэалізацыю сістэмы менеджменту якасці Установы.

## ГЛАВА 4
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ УСТАНОВЫ. СТРУКТУРА І КІРАВАННЕ

37. Установа ў адпаведнасці з заканадаўствам мае наступныя правы:

ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць;

фарміраваць структуру і штатны расклад Установы;

ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць прыбыткі;

удзельнічаць у навуковай, навукова-даследчай, навукова-тэхнічнай, інфармацыйна-аналітычнай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці, дзейнасці па арганізацыйным і навукова-метадычным забеспячэнні адукацыі;

ажыццяўляць праверку сапраўднасці дакументаў аб адукацыі пры прыманні асоб для засваення адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі і пры ўзнікненні сумненняў у іх сапраўднасці шляхам направлення запытаў у Міністэрства адукацыі аб пацвярджэнні факту іх выдання;

уваходзіць у склад асацыяцый (саюзаў) і іншых аб’яднанняў некамерцыйных арганізацый;

ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі;

арганізоўваць навуковыя (навукова-тэарэтычныя, навукова-метадычныя, навукова-практычныя) канферэнцыі, семінары, выставы, фестывалі, конкурсы і іншыя метадычныя мерапрыемствы;

праводзіць маніторынг, аўдыт і кансалтынг адукацыйнай і кіраўніцкай дзейнасці Установы па заказе органаў кіравання і ўстаноў адукацыі;

усталёўваць тарыфы і расцэнкі на ўсе віды аказваемых платных работ і паслуг у адпаведнасці з заканадаўствам;

ажыццяўляць выдавецкую, паліграфічную, інфармацыйную дзейнасць і рэалізацыю прадукцыі гэтых відаў дзейнасці пры наяўнасці адпаведных дазволаў;

ажыццяўляць іншыя віды дзейнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам, якія не супярэчаць сапраўднаму Статуту.

38. Установа ў адпаведнасці з заканадаўствам абавязана:

забяспечваць якасць адукацыі;

ажыццяўляць распрацоўку і зацвярджэнне ва ўстаноўленым парадку навукова-метадычнага забеспячэння дадатковай адукацыі дарослых, яго ўдасканаленне;

ажыццяўляць падбор, прыём на працу і расстаноўку кадраў, павышэнне іх кваліфікацыі;

удасканальваць матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з устаноўленымі санітарнымі нормамі, правіламі і гігіенічнымі нарматывамі;

ствараць бяспечныя ўмовы пры арганізацыі адукацыйнага працэсу;

ажыццяўляць распрацоўку і прыняцце правілаў унутранага распарадку для слухачоў, правілаў унутранага працоўнага распарадку;

забяспечваць маральнае і матэрыяльнае стымуляванне педагагічных і іншых работнікаў Установы, меры іх сацыяльнай абароны;

забяспечваць азнаямленне асоб пры залічэнні ва Установу з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, Статутам, спецыяльным дазволам (ліцэнзіяй) на адукацыйную дзейнасць, сертыфікатамі аб дзяржаўнай акрэдытацыі, а па іх патрабаванні – і з вучэбна-праграмнай дакументацыяй;

садзейнічаць упаўнаважаным дзяржаўным органам у правядзенні кантролю па забеспячэнні якасці адукацыі;

ажыццяўляць іншыя абавязкі ў адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

39. Структурныя падраздзяленні Установы ствараюцца і спыняюць сваю дзейнасць на падставе загада рэктара і дзейнічаюць у адпаведнасці з Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дарослых, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі ад 28 ліпеня 2011 г. № 198, іншымі актамі заканадаўства, Статутам Установы, Палажэннем аб адпаведным структурным падраздзяленні, якое зацвярджаецца рэктарам Установы.

40. Прававое палажэнне і функцыі структурных падраздзяленняў Установы вызначаюцца сапраўдным Статутам і адпаведнымі пастановамі, зацверджанымі ва ўстаноўленым парадку.

41. Кіраванне Установай ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам і сапраўдным Статутам, будуецца на прынцыпах спалучэння адзінаначалля і самакіравання.

42. Кампетэнцыя Заснавальніка Установы:

прыняцце ва ўстановленым заканадаўствам парадку рашэння аб стварэнні, рэарганізацыі і ліквідацыі Установы;

зацвярджэнне Статута, прыняцце рашэння аб унясенні змен і дадаткаў;

забеспячэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы і яе фінансаванне;

кантроль за выкарыстаннем і зберажэннем маёмасці;

іншыя правы і абавязкі ў адпаведнасці з заканадаўствам.

43. Агульнае кіраўніцтва дзейнасцю Установы ажыццяўляецца рэктарам, які прызначаецца на пасаду і вызваляецца з пасады загадам начальніка галоўнага ўпраўлення адукацыі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта, па ўзгадненні з Гомельскім абласным выканаўчым камітэтам, Гомельскім гарадскім выканаўчым камітэтам і Міністэрствам адукацыі.

44. Рэктар Установы ў межах сваіх паўнамоцтваў, у адпаведнасці з сапраўдным Статутам і іншымі актамі заканадаўства:

дзейнічае ад імя Установы без даверанасці і нясе адказнасць за вынікі яе дзейнасці;

у межах сваёй кампетэнцыі выдае загады і распараджэнні, абавязковыя для ўсіх работнікаў і слухачоў;

заключае дагаворы, выдае даверанасці, адкрывае рахункі ў банках у межах сваёй кампетэнцыі;

наймае і звальняе педагагічных і іншых работнікаў Установы, вызначае іх службовыя абавязкі, сцвярджае службовыя інструкцыі;

праводзіць падбор прафесарска-выкладчыцкага саставу;

ажыццяўляе кіраўніцтва планаваннем і арганізацыяй адукацыйнага працэсу, кантроль за яго ходам і вынікамі, уздзейнічае на якасць і эфектыўнасць работы Установы;

зацвярджае структуру і штатны расклад Установы ў межах выдзеленых асігнаванняў, структуру і штатны расклад гаспадарча-разліковых падраздзяленняў;

забяспечвае стварэнне ўмоў для творчага росту супрацоўнікаў Установы;

нясе персанальную адказнасць за вынікі работы Установы, забяспечвае фінансавую дысцыпліну, правілы аховы працы і пажарнай бяспекі;

уносіць ва Упаўнаважаны орган прапановы аб зменах і дапаўненнях дадзенага Статута;

у межах, вызначаных дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і дадзеным Статутам, распараджаецца маёмасцю, у тым ліку сродкамі Установы, і нясе персанальную адказнасць за захаванне маёмасці і яе эфектыўнае выкарыстанне;

займаецца пытаннямі міжнароднага супрацоўніцтва;

ажыццяўляе іншыя правы і абавязкі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

Рэктар Установы самастойна вырашае ўсе пытанні дзейнасці Установы, за выключэннем аднесеных актамі дзеючага заканадаўства і Статутам Установы да кампетэнцыі Уласніка, Упаўнаважанага органа, агульнага сходу працоўнага калектыву.

Падчас адсутнасці рэктара на падставе загада галоўнага ўпраўлення адукацыі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта яго абавязкі выконвае і нясе поўную адказнасць за іх выкананне адзін з прарэктараў па асноўнай дзейнасці Установы, які можа дзейнічаць ад імя Установы без даверанасці і мае права подпісу распараджальных, фінансавых і банкаўскіх дакументаў.

45. Рэктар Установы ў дзейнасці па кіраванні Установай узаемадзейнічае з органамі самакіравання Установы.

Выбарным калегіяльным органам самакіравання Установы з’яўляецца Савет інстытута, які ўзначальваецца рэктарам.

Савет ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб Савеце ўстановы адукацыі, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 84 і распрацаваным на яго аснове Палажэннем аб Савеце інстытута, іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і сапраўдным Статутам.

Агульная колькасць Савета – 30 чалавек, тэрмін паўнамоцтваў Савета – 5 гадоў. Якасны склад Савета вызначаецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб Савеце інстытута.

46. Прыём на работу грамадзян ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

## ГЛАВА 5
## МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ І ФІНАНСАВАННЕ УСТАНОВЫ

47. Крыніцамі фінансавання Установы з’яўляюцца:

сродкі абласнога бюджэту;

сродкі, атрыманыя ад дзейнасці Установы, якая прыносіць прыбыткі;

добраахвотныя ахвяраванні і мэтавыя ўзносы айчынных і замежных юрыдычных і фізічных асоб;

іншыя крыніцы, не забароненыя дзеючым заканадаўствам.

Установа не мае права без згоды Уласніка, Заснавальніка, Упаўнаважанага органа адчужаць ці іншым спосабам распараджацца

замацаваным за ёй на праве аператыўнага кіравання маёмасцю і маёмасцю, набытай за кошт сродкаў абласнога бюджэту.

48. Матэрыяльна-тэхнічную базу Установы складаюць будынкі, збудаванні, абсталяванне, транспартныя сродкі, а таксама іншая маёмасць, неабходная для рашэння яе мэт і задач, вартасць якіх паказваецца ў адпаведных бухгалтарскіх рэгістрах.

Для арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку праходжання стажыроўкі, можа выкарыстоўвацца матэрыяльна-тэхнічная база іншых арганізацый у парадку, прадугледжаным дзеючым заканадаўствам.

49. Атрыманыя прыбыткі і маёмасць, набытая за кошт прыбыткаў ад дзейнасці, якая прыносіць прыбыткі, паступаюць у аператыўнае кіраванне Установы, выкарыстоўваюцца і ўлічваюцца ёй у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

50. Сродкі, атрыманыя Установай ад дзейнасці, якая прыносіць прыбыткі, паступаюць у самастойнае распараджэнне, улічваюцца на асобным балансе, калі іншае не прадугледжана дзеючым заканадаўствам, і выдзяляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам і Статутам Установы. Нарматывы па ажыццяўленні дзейнасці, якая прыносіць прыбытак, не ўстанаўліваюцца.

51. Аказанне платных паслуг у сферы адукацыі не можа ажыццяўляцца замест або ў рамках адукацыйнай дзейнасці, якая фінансуецца за кошт сродкаў бюджэту.

52. Аплата працы педагагічных і іншых работнікоў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

53. Кантроль за фінансава-гаспадарчай дзейнасцю Установы ажыццяўляецца ў парадку, прадугледжаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 6
## УЛІК, СПРАВАЗДАЧНАСЦЬ І КАНТРОЛЬ ЗА ДЗЕЙНАСЦЮ УСТАНОВЫ

54. Установа вядзе ва ўстаноўленым парадку справаводства, архіў, прадстаўляе звесткі, прадугледжаныя нарматыўнымі прававымі актамі ў адпаведныя органы дзяржаўнага кіравання.

55. Установа ажыццяўляе аператыўны і бухгалтарскі ўлік вынікаў сваёй дзейнасці, прадстаўляе ва ўстаноўленым парадку статыстычную справаздачнасць у органы статыстыкі. Бухгалтарскую справаздачнасць і аператыўную інфармацыю аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці накіроўвае Упаўнаважанаму органу, калі іншае не предугледжана заканадаўствам.

56. За непрадастаўленне і (ці) скажэнне дзяржаўнай справаздачнасці, парушэнне тэрмінаў яе прадстаўлення службовыя асобы Установы нясуць адказнасць, устаноўленую заканадаўствам.

57. Кантроль за забеспячэннем Установай якасці адукацыі ажыццяўляецца ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі ў парадку і з перыядычнасцю, у адпаведнасці з заканадаўствам.

58. Установа ажыццяўляе самакантроль забеспячэння якасці адукацыі: комплексны аналіз адукацыйнай дзейнасці, які ўключае самаправерку і самаацэнку адукацыйнай дзейнасці, у парадку і з перыядычнасцю, вызначанай рэктарам Установы.

## ГЛАВА 7
## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

59. Установа мае права ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку ажыццяўляць сувязі з вучэбнымі ўстановамі замежных краін у галіне адукацыйнай дзейнасці, ажыццяўляць іншыя формы супрацоўніцтва на ўзаемавыгадных умовах.

60. Павышэнне кваліфікацыі і перепадрыхтоўка замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца або часова пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам па прамых дагаворах, заключаных Установай з замежнымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, а таксама ў рамках міжнародных і нацыянальных дагавораў, праектаў і праграм у сферы адукацыі і культуры.

## ГЛАВА 8
## РЭАРГАНІЗАЦЫЯ І ЛІКВІДАЦЫЯ УСТАНОВЫ

61. Рэарганізацыя і ліквідацыя Установы ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

62. Установа лічыцца ліквідаванай з даты прыняцця рэгіструючым органам рашэння аб унясенні запісу ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў аб выключэнні яе з гэтага рэгістра.

Рэктар інстытута В.Л.Акуленка